Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 СНЕЖНЯ 2018 г. АЎТОРАК № 233 (28849)

СМІ ПРАЦУЮЦЬ ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ 3

АЎТАР «КАМЕНСКАЙ» АЛЯКСАНДРА МАРЫНІНА

# Прывітанне, зіма!

Сяброўкі-равесніцы катаюцца на хоць і не надта, але ўжо заснежанай горцы ў мінскім мікрараёне Чкалаўскі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЛІЧБА ДНЯ

**Br5,24 млрд**

*склаў у студзені — кастрычніку 2018 года прафіцыт рэспубліканскага бюджэту, паведамляе Міністэрства фінансаў. Даходы рэспубліканскага бюджэту склалі Br20,36 млрд, або 96,9 % плана. Паступленне ПДВ склала Br9,2 млрд (91,1 % плана). Падатку на прыбытак паступіла Br2,7 млрд (82,8 %). Акцызы паступілі ў суме Br2,2 млрд (88,4 %). Даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці склалі Br4,5 млрд (117,8 %). Расходы рэспубліканскага бюджэту склалі Br15,12 млрд (72,9 %). На агульнадзяржаўную дзейнасць накіравана Br6,4 млрд (63%), на фінансаванне нацыянальнай эканомікі — Br3,6 млрд (79,1 %), на фінансаванне сацыяльнай сферы (сацыяльная палітыка, адукацыя, ахова здароўя, фізічная культура, спорт, культура і сродкі масавай інфармацыі) — Br11,2 млрд (78,3 %).*

## КОРАТКА

- **У Беларусі прапануюць устанаўліваць апеку над дзецьмі, калі бацькі з уважлівых прычын адсутнічаюць больш за шэсць месяцаў.**
- З 1 снежня ў краіне аднавілі бюджэтнае фінансаванне агульных аддзяленняў лазняў і душавых у сельскай мясцовасці.



- **Айчынныя вытворцы плануюць пастаўляць у Кітай мех беларускай норкі.**
- Трупа Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета адправіцца на гастролі ў Аўстрыю і Германію.
- **У Мазырскім раёне ў выніку дрыфта на тонкім лёдзе вадаёма легкавы аўтамабіль праваліўся пад лёд.**

Вандроўка патрыёта

## «КУТОЧАК БЕЛАРУСІ — МАЛЕНЬКАЯ РАДЗІМА»

У Беларусі распрацоўваюць трансгранічны маршрут з Оршы ў Смаленск праз Шклоў і Александрыю

Фота Андрэя САЗОНАВА.

СТАР. 4

## АГОНЬ НЕ ТОЛЬКІ ГРЭЕ

У першыя дні снежня ў агні загінулі 10 чалавек

**Сёлетняя каляндарная зіма стартавала марозным акордам. Першыя два дні снежня адзначыліся не толькі дарожна-транспартнымі здарэннямі, якія адбываліся на заснежаных дарогах, але і ажно сямюдзесяццю пажарамі. У іх загінула дзесяць чалавек.**

Прычым у трох выпадках на адным пажары развіталіся з жыццём адразу два чалавекі.

У 4.30 раніцы ў нядзелю ў вёсцы Белавусаўшчына Пружанскага раёна загарэўся трохкватэрны цагляны дом. Дзве кватэры ў доме былі нежылыя, а вось у трэцяй знаходзіліся 65-гадовая гаспадыня і яе сужыцель. Іх целы ратавальнікі знайшлі пад завалам.

Чатырма гадзінамі раней тушылі нежылы дом у Бабруйску. Там знаходзіліся двое мужчын, якія самавольна праніклі ў пабудову. Іх асобы пакуль не высветлены. А ў ноч на трэцяга снежня загарэўся дачны дом у пасёлку Ільіч Гомельскага раёна. Калі ратавальнікі прыбылі на месца падзей, то ўбачылі, што адкрытым полымем гараць дом, гараж і гаспадарчая пабудова. З-за агню ў доме абрынуліся перакрыцці. Разабраўшы іх рэшткі, пажарныя знайшлі цела гаспадыні дома, 79-гадовай пенсіянеркі. У іншым пакоі на падлозе ляжаў яе 48-гадовы сын, таксама мёртвы.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!